# З ПРАМОВЫ таварыша ЗІМЯНІНА М. В.

**(Сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі)**

**Дарагія сябры — камсамольцы і моладзь Беларусі!**

Больш года лютуе на Беларусі паганая арда гітлераўцаў.

Маладое пакаленне беларускага народа за год нямецкай акупацыі выпрабавала ўвесь жах фашысцкага так званага «новага парадку».

Гітлераўцы зруйнавалі нашы гарады, вытапталі нашы нівы, знішчылі нашы школы. Смяротная небяспека фізічнага знішчэння і вечнага прыгнёту нямецка-фашысцкімі рабаўласнікамі і катамі пагражае маладому пакаленню Беларусі.

Але моладзь не схіліла галавы перад ненавісным ворагам. За гэты год мы прайшлі вялікую школу нянавісці да нямецкіх акупантаў. Мы ненавідзім гітлераўскіх мярзотнікаў усёй сілай нашай душы. У радах Чырвонай Арміі і ў партызанскіх атрадах многія тысячы маладых беларусаў, разам з усім савецкім народам, у напружаных баях знішчаюць немцаў і набліжаюць час поўнага разгрому акупантаў. І як-бы цяжка ні было выпрабаванне, беларуская моладзь ніколі не надзене на сябе ярмо рабства нямецкіх баронаў.

З кожным днём і часам расце армія народных мсціўцаў. Смерць немцу! — вось зараз адзіная мэта кожнага савецкага чалавека.

Вялікая любоў да радзімы і няспынная нянавісць да ворага выкавалі такіх маладых сыноў беларускага народа, як Героі Савецкага Саюза — выхаванцы Ленінскага камсамола лётчыкі Нікалай Гастэла, Віктар Талаліхін, Іван Каўшараў, снайпер Феадосій Смалячкоў, партызаны Міхаіл Сільніцкі і Владзімір Курыленка.

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь